**РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**
**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

# АБ СПЫНЕННІ ПАЛІТЫЧНАГА ПЕРАСЛЕДУ Ў БЕЛАРУСІ, ВЫЗВАЛЕННІ ПАЛІТВЯЗНЯЎ, ПАДТРЫМЦЫ РЭПРЭСАВАНЫХ І ІХ СЕМ'ЯЎ

8–9 жніўня, Варшава

Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі не спыняюцца, набываючы больш латэнтны і жорсткі характар. Рэжым Лукашэнкі свядома хавае сапраўдны маштаб тэрору, у той час як у краіне штодня адбываюцца новыя затрыманні. На сённяшні дзень праваабарончая супольнасць афіцыйна прызнае каля 1000 чалавек палітычнымі зняволенымі, аднак рэальная колькасць людзей, якія ўтрымліваюцца ў турмах па палітычных матывах, у разы большая.

Беларускія дэмакратычныя сілы высока ацэньваюць намаганні дзяржаў і ў першую чаргу адміністрацыі ЗША, міжнародных арганізацый, праваабарончых і гуманітарных арганізацый, і іншых удзельнікаў, якія садзейнічалі вызваленню палітычных зняволеных. Мы падтрымліваем далейшую каардынацыю гуманітарных, дыпламатычных і санкцыйных інструментаў дзеля вызвалення палітычных зняволеных, захавання незалежнасці Беларусі, спынення рэпрэсій і саўдзелу рэжыму ў расійскай агрэсіі. Магчымы перагляд асобных санкцый павінен быць суразмерным канкрэтным дзеянням рэжыму і не ствараць стымулаў для новых захопаў закладнікаў.

**Мы, прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сіл, супольна патрабуем:**

- Поўнага, неадкладнага і безумоўнага вызвалення ўсіх асобаў, зняволеных па палітычных матывах у Беларусі.
- Спынення выкарыстання палітвязняў у якасці закладнікаў і інструмента палітычнага прымусу.
- Падтрымліваючы гуманітарныя і дыпламатычныя намаганні па іх вызваленні, мы настойваем на безумоўным забеспячэнні правоў, годнасці і свабоднага выбару людзей, якія выходзяць на волю.
- Недапушчальнасці прымусовай высылкі або вывазу палітвязняў за межы Беларусі без іх свабоднай і інфармаванай згоды замест іх рэальнага вызвалення на радзіме.
- Поўнага спынення палітычна матываванага пераследу, скасавання ўсіх неправасудных рашэнняў і поўнай рэабілітацыі пацярпелых — як тых, хто застаецца ўнутры Беларусі, так і тых, хто быў вымушаны пакінуць краіну.

**Мы заклікаем дэмакратычныя краіны свету і міжнародныя арганізацыі:**

1. Захоўваць стратэгічную мэту па поўным вызваленні ўсіх палітычных зняволеных, выкарыстоўваючы пры гэтым усе разумныя магчымасці для неадкладнага вызвалення асобных людзей і груп без легітымацыі далейшага ўтрымання астатніх.

2. Выкарыстоўваць усе наяўныя інструменты міжнароднага ціску і прымусу рэжыму да поўнага і канчатковага спынення палітычна матываванага пераследу, уключаючы прыцягненне да адказнасці вінаватых у злачынствах супраць чалавецтва і прымяненне прынцыповага сістэмнага прымусу.
3. Павялічыць доўгатэрміновую падтрымку праваабарончаму і гуманітарнаму сектарам беларускай грамадзянскай супольнасці, якія фіксуюць злачынствы рэжыму, падтрымліваюць тых, хто трапляе пад рэпрэсіі і выходзіць з-за кратаў, а таксама дапамагаюць сем'ям зняволеных і рэпрэсаваных.
4. Адвакатаваць праграмы доўгатэрміновай маштабнай сацыялізацыі і адаптацыі (уключаючы медыцынскую, псіхалагічную, юрыдычную і іншыя віды дапамогі) для былых палітвязняў, палітычна рэпрэсаваных і іх сем’яў як унутры Беларусі, так і ў краінах эміграцыі.
5. У краінах пражывання спрашчаць доступ да легальнага статусу, міжнароднай абароны, гуманітарных віз, альтэрнатыўных дакументаў, рынку працы і працэдур сямейнага ўз'яднання палітвязняў і рэпрэсаваных асоб з улікам індывідуальных абставін кожнага чалавека.

**Са свайго боку, беларускія дэмакратычныя сілы абавязваюцца:**

- Забяспечваць неабходную каардынацыю палітычных і гуманітарных працэсаў, накіраваных на вызваленне палітвязняў, адвакацыю інтарэсаў рэпрэсаваных і падтрымку іх сем’яў.
- Падтрымліваць сістэмную працу па фіксацыі злачынстваў рэжыму, зборы доказаў і садзейнічанні міжнародным судовым інстанцыям (у тым ліку МКС у Гаазе) для прыцягнення вінаватых да адказнасці.
- Падтрымліваць і прасоўваць комплексныя планы і праграмы доўгатэрміновай рэабілітацыі і падтрымкі для рэабілітацыі ўсіх пацярпелых ад дзеянняў рэжыму.
- Умацоўваць партнёрства з міжнароднымі інстытуцыямі і ўрадамі, каб дапамога былым палітвязням і рэпрэсаваным бюракратычна спрашчалася і даходзіла да кожнага, хто мае ў ёй патрэбу.
- Захоўваць супольную пазіцыю і адзінства ў прынцыповых пытаннях непарушнасці правоў чалавека, суверэнітэту Беларусі і непазбежнасці пакарання за рэпрэсіі.

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб’яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*